**Храпавіцкая, Н.** Жыццядайны аптымізм / Н. Храпавіцкая // Лепельскі край. — 2020. — 31 ліп. — С. 9.

# ЖЫЦЦЯДАЙНЫ АПТЫМІЗМ

**Ігар Вішнеўскі, які прайшоў нялёгкімі шляхамі Афганістана, не развітваецца з творчасцю і разам з работнікамі культуры сваімі спевамі радуе жыхароў раёна**



*У час размовы з жыхарамі раёна кожны раз упэўніваюся, што наш край багаты на таленавітых людзей. На гэты раз хачу распавесці пра кіроўцу дзяржаўнай установы культуры «Лепельскі раённы Дом культуры» Ігара ВІШНЕЎСКАГА.*

Маё знаёмства з Ігарам Анатольевічам адбылося напярэдадні Дня дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый. Чаму напярэдадні гэтага свята? Мой суразмоўца праходзіў службу менавіта ў гэтых войсках.

## ГОРНАЯ КІРГІЗІЯ...

Нарадзіўся Ігар у 1965 годзе ў горадзе Фрунзе (Кіргізія) у сям'і рабочых. Бацькі ўсё жыццё адпрацавалі на машынабудаўнічым заводзе імя Леніна: бацька – токарам, маці – у аддзеле кантролю.

У Кіргізіі – маляўнічая прырода, якая зачароўвае сваёй прыгажосцю. Зялёныя горныя схілы, шум горных рэк, высакагорныя азёры завабліваюць турыстаў у гэтую краіну.

У Беларусі для таго, каб адпачыць, людзі накіроўваюцца ў лес, а ў Кіргізіі – у горы. Ноч у палатцы, дзе да неба можна дакрануцца рукой, – гэтыя ўражанні немагчыма перадаць словамі, – адзначае Ігар Анатольевіч. – Мне падабалася разам з сябрамі і на леднікі схадзіць – так называюць лёд на вяршынях гор.

Як адзначае мой суразмоўца, паветра ў Кіргізіі больш гарачае, чым у Беларусі, аднак успрымаецца лягчэй з-за нізкай вільготнасці.

Пасля заканчэння васьмігодкі Ігар паступіў у Фрунзенскі машынабудаўнічы тэхнікум. Атрымаўшы прафесію тэхніка-тэхнолага, пачаў працоўны шлях на заводзе токарам на станку з лічбавым праграмным кіраваннем. Аднак юнак затрымаўся там не надоўга – усяго на некалькі месяцаў, бо 10 мая 1984 года быў прызваны ва Узброеныя Сілы СССР Ленінскім РВК горада Фрунзе.

## НА ВАЙНЕ...

Ля Алма-Аты ёсць горад Капчагай, дзе навабранец і праходзіў службу першыя 10 месяцаў. Потым усю часць адправілі ў правінцыю Гельмінт, што недалёка ад Кандагара Рэспублікі Афганістан.

У Афганістане Ігар Анатольевіч праходзіў службу з 25 сакавіка 1985 года па 5 мая 1986-га. На аўтамабілі «Урал» забяспечваў ваеннаслужачых прадуктамі і ўсім неабходным.

Размяшчалася часць у пустыні. Спачатку жылі ў палатках, а потым самастойна ўзводзілі вялікія казармы з распаўсюджанага ў тых мясцінах будаўнічага матэрыялу – саломы і гліны.

Зімой у Афганістане вялікіх маразоў не было, але перапады тэмпературы днём і ноччу былі значныя. – Пакуль памыеш штаны, куртка ўжо і высахла, – так коратка апісвае надвор'е ў Афганістане, сухое і спякотнае, Ігар Вішнеўскі. – Аднак калі пад сонцам можна загараць, пад месяцам лепш апрануць фуфайку.

Бацькі ведалі, дзе праходзіць службу іх сын, але ў сваіх лістах радавы Ігар Вішнеўскі падрабязнасцяў не расказваў.

Сярод саслужыўцаў былі хлопцы розных нацыянальнасцяў, і з усімі малады салдат меў таварыскія адносіны. А там па-іншаму было нельга.

Ігару, як і шматлікім воінам-інтэрнацыяналістам, даводзілася бачыць смерць саслужыўцаў. Таму, напэўна, пра вайну ён імкнецца не ўспамінаць і больш распавядае пра побыт вайскоўцаў на афганскай зямлі.

Так, напрыклад, Ігар Анатольевіч з усмешкай расказвае, як вайскоўцы зрабілі гітару са скрыні з-пад патронаў. Толькі б грыф і струны былі, а астатняе можна было і самому змайстраваць.

У паветрана-дэсантныя войскі хлопец трапіў ужо напрактыкаваным. З-за сваёй цікаўнасці яшчэ да прызыву ў войска наведваў авіяклуб, дзе шэсць разоў скакаў з парашутам. Потым і падчас службы яшчэ сем разоў паспытаў смаку паветра на вышыні. Дадаткова ад ваенкамата атрымаў спецыяльнасць кіроўцы.

У 1986 годзе Ігар вярнуўся са службы, а ў 1987-м ажаніўся з дзяўчынай Тамарай, з якой пазнаёміўся на вяселлі аднапалчаніна.

У 1993 годзе сям'я Вішнеўскіх пераехала ў Беларусь, якая з цягам часу стала дарагім і блізкім кутком.

## ТВОРЧЫ ШЛЯХ

З песняй і гітарай мой суразмоўца ідзе па жыцці даўно. Аднак адкуль такія здольнасці, бо не вучыўся ж ён гэтаму майстэрству ў прафесіяналаў?

– Калі паступіў у тэхнікум, разам з іншымі навучэнцамі перад пачаткам заняткаў наведваў калгас. Там адзін з хлопцаў быў невысокага росту, яшчэ ніжэйшы за мяне. Дарэчы, я заўсёды ва ўсіх шарэнгах па росце стаяў апошнім. Мой аднакурснік так добра выконваў розныя кампазіцыі, што заўсёды прыцягваў увагу дзяўчат. Тады я і вырашыў, што абавязкова павінен навучыцца граць на гітары. У той час захапляўся кампазіцыямі гуртоў «Машына часу», «Зямляне», песнямі Юрыя Антонава.



Дзесяць гадоў Ігар працуе ў раённым Доме культуры, з іх апошнія пяць выступае на сцэне.

– Мая былая супрацоўніца Марына Колас заўсёды ў мяне пыталася: «Ну, калі ты ўжо сыграеш на сцэне на гітары?». І вось аднойчы, другога жніўня на Дзень дэсантных войскаў і сіл спецыяльных аперацый, я згадзіўся. З таго часу выступаю разам з мясцовымі артыстамі.

Праца ў Ігара Анатольевіча, як ён кажа, цікавая. У кампаніі з творчымі людзьмі сам пачынаеш захапляцца мастацтвам. Мужчыну нават не пужае тое, што часам даводзіцца працаваць да глыбокай ночы, бо кіроўца вяртаецца з мерапрыемства дадому апошнім.

Пазітыў і творчая энергія Ігара Анатольевіча зараджаюць не толькі калег, а і ўсю яго сям'ю. Унуку Севасцьяну ўжо споўнілася тры гады. Малады дзядуля ганарыцца кожным, нават самым невялікім, поспехам хлопчыка і лічыць сябе шчаслівым. У вольны ж час Ігар Анатольевіч любіць пахадзіць па лесе, падыхаць свежым паветрам і назапасіць для сям'і грыбоў і ягад.

***

Напярэдадні Дня дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый кіраўніцтва Лепельскай раённай арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» выказвае шчырыя словы віншаванняў воінам-інтэрнацыяналістам і ўсім, хто праходзіў службу ў гэтых войсках. Гэта свята сапраўдных мужчын, якія ніколі не кідаюць слоў на вецер.

***Калектыў рэдакцыі таксама далучаецца да шчырых віншаванняў. Моцнага вам здароўя, жыццёвага аптымізму, шчасця і поспехаў ва ўсіх справах!***

**Наталля ХРАПАВІЦКАЯ**